Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Тэатральна-відовішчнае прадпрыемства
”Дзяржаўны маладзёжны тэатр эстрады“
01.08.1997 – 19.10.2000

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі універсітэт культуры
Дзяржаўная тэатральна-відовішчная ўстанова ”Маладзёжны тэатр эстрады“
19.10.2000 – 19.01.2001

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры
Дзяржаўная тэатральна-відовішчная ўстанова ”Маладзёжны тэатр эстрады“
19.01.2001 – 08.10.2004

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў
Дзяржаўная тэатральна-відовішчная ўстанова ”Маладзёжны тэатр эстрады“
08.10.2004 – 13.12.2006

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Дзяржаўная тэатральна-відовішчная ўстанова ”Маладзёжны тэатр эстрады“
13.12.2006 –

ФОНД № 498
ВОПІС № 3 (дадатковая)
спраў пастаяннага захоўвання
за 1997 – 2007 гг.

ГІСТОРЫКА-АРХІЎНАЯ ДАВЕДКА (працяг)

Да фонду Дзяржаўнай
тэатральна-відовішчнай
установы "МАЛАДЗЁЖНЫ ТЭАТР ЭСТРАДЫ"
за 2008-2021 гг.
Фонд № 498

За перыяд 2008-2021 гг. асноўныя функцыі і задачы Дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы "Маладзёжны тэатр эстрады" (далей – тэатра) заставаліся нязменнымі.

Згодна з штатным раскладам, зацверджаным дырэктарам тэатра 03.03.2008, уведзена ў дзейнасць наступная структура тэатра:

адміністрацыйна-кіраўнічы апарат;

бухгалтэрыя;

рэжысёрска-пастановачная група:

- канцэртны аддзел;
- асвятляльнатэхнічная служба;
- гукарэжысёрская служба;

артыстычны састаў;

адміністрацыйна-гаспадарчая служба.

Загадам дырэктара тэатра ад 01.10.2010 № 115-к створаны аддзел рэпертуарнага планавання.[1]

Загадам ад 01.04.2011 № 33 аддзел па эксплуатацыі будынка і тэхнічным абслугоуванні перайменаваны ў аддзел па эксплуатацыі і тэхнічным абслугоўванні будынкаў і збудаванняў; аддзел рэпертуарнага планавання - у рэкламна-рэдакцыйны аддзел; рэжысёрска-пастановачную групу - ў службу галоўнага рэжысёра; мастацка-пастановачную групу - у мастацка-пастановачную частку.[2]

Загадам дырэктара тэатра ад 13.01.2014 № 7 мастацка-пастановачная частка рэарганізавана шляхам далучэння яе да службы галоўнага рэжысёра.[3]

Загадам дырэктара тэатра ад 04.09.2014 № 76 у якасці структурнага падраздзялення створаны Нацыянальны цэнтр музычнага мастацтва імя В.Г.Мулявіна.[4]

Загадам дырэктара тэатра ад 28.01.2021 № 6-од выключана рэжысёрска-пастановачная частка;  уведзена служба галоўнага рэжысёра.[5]

У 2024 годзе установай "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва" (далей – БДАМЛМ) праведзена ўпарадкаванне дакументаў тэатра за 2008–2021 гг. У выніку апрацоўкі складзены: гістарычная даведка да фонду (працяг) за 2008-2021 гг., вопіс № 1 (працяг) спраў пастаяннага захоўвання за

---

[1] Ф.498. Воп.2лс. Спр.152. Л.158
[2] Ф.498 Воп.1. Спр.135. Л.53
[3] Ф.498. Воп.1. Спр.174. Л.8.
[4] Ф.498 Воп.1. Спр.174. Л.123
[5] Ф.498. Воп.1. Спр.288. Л.18.

2008–2021 гг., вопіс № 2лс (працяг) спраў па асабовым складзе за 2008–2021 гг.

У вопіс № 1 (працяг) пастаяннага захоўвання ўвайшлі: загады дырэктара тэатра па асноўнай дзейнасці, штатныя расклады, пратаколы пасяджэнняў мастацкага савету тэатра, планы, справаздачы і статыстычныя справаздачы па асноўных накірунках дзейнасці тэатра, перапіска з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, Мінгарвыканкамам і іншымі ўстановамі па пытаннях асноўнай дзейнасці і інш. Да загадаў дырэктара тэатра па асноўнай дзейнасці прыкладзены дакументы: Палажэнне студыі танца “Кнопки” (№ 65 ад 02.12.2019)[6], палажэнне Нацыяльнага цэнтра музычнага мастацтва імя В.Г.Мулявіна (№ 91 ад 01.10.2014)[7], палажэнне тэатральнай майстэрні “Вображария” (№ 36 ад 10.08.2018)[8], палажэнне студыі “СтретчингKids” (№ 38 ад 10.08.2018)[9]. Да пратаколаў пасяджэнняў мастацкай рады тэатра прыкладзены сцэнарый м’юзікла “Свадьба на восточный манер”, рэж. І.Гаранец (2009).

Пры правядзенні ўпарадкавання дакументаў тэатра за перыяд 2008-2021 гг. было выяўленна адсутнасць наступных дакументаў пастаяннага захоўвання: статыстычныя справаздачы па асноўных накірунках і відах дзейнасці тэатра за 2008 г.; фінансавая смета ППА і справаздача аб яе выкананні за 2013-2014, 2016-2021 гг.; пратаколы агульнага сходу ППА за 2008-2016 гг.; статыстычная справаздача ППА за 2013, 2015 гг.

Справы ў вопісе сістэматызаваны па храналагічна-намінальным прынцыпе. Усяго ў вопіс уключана 204 справы.

У вопіс № 2лс (працяг) па асабовым складзе ўвайшлі: загады дырэктара тэатра па асабовым складзе, асабовыя рахункі работнікаў, асабовыя справы звольненых работнікаў. Загады дырэктара тэатра па асабовым складзе (сацыяльны адпачынак) за 2008–2012 гг. фарміраваліся разам з загадамі, тэрмін захоўвання якіх 3 гады, пад адной валавай нумарацыяй, у сувязі з чым яны ўключаны ў вопіс № 2лс. У вопісе адсутнічаюць асабовыя карткі работнікаў тэатра за 2019-2021 гг.

Справы ў вопісе сістэматызаваны па храналагічна-намінальным прынцыпе, справы звольненых работнікаў – па алфавіце прозвішчаў. Усяго ў вопіс уключана 373 справы.

Дакументы, уключаныя ў вопісы, раскрываюць дзейнасць тэатра за гэты перыяд. Фізічны стан спраў здавальняючы. Справы, уключаныя ў вопісы пераплецены, пранумараваны, вокладкі спраў аформлены.

У вопіс № 3 (дадатковая) пастаяннага захоўвання ўключаны 19 спраў за 1997-2007 гг., абнаружаныя падчас апрацоўкі дакументаў тэатра за 2008-2021 гг.: дагаворы на правядзене канцэртаў і культурна-масавых мерапрыемстваў,

---

[6] Ф.498. Воп.2лс. Спр.256. Л.202-214.
[7] Ф.498. Воп.2лс. Спр.175. Л.3-12.
[8] Ф.498. Воп.2лс. Спр.242. Л.153-165.
[9] Ф.498. Воп.2лс. Спр.242. Л.177-186.

штатны расклад, вытоврча-фінансавы план, фінансавая смета і справаздача аб яе выкананні, статыстычная справаздача ППА, сцэнарыі і інш.

Вядучы архівіст
аддзела архіваў арганізацый і фарміравання НАФ
Установы “Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва” Н.П.Прынько

Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь

Дзяржаўная тэатральна-
відовішчная ўстанова
“Маладзёжны тэатр эстрады”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар тэатра
____________С.У.Мядзведзеў
____________2024

Фонд № 498
Вопіс № 3 (дадатковая)
спраў пастаяннага захоўвання
за 1997-2007 гг.

| № п/п | Індэкс справы | Загаловак справы | Крайнія даты | Кол-сць лістоў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| | | 1997 год | | | |
| 1 | | Пратаколы № 1, 3 пасяджэнняў мастацкага савета тэатра | 11.11.1997<br>04.12.1997 | 8 | |
| | | 1998 год | | | |
| 2 | | Пратаколы № 4, 13 пасяджэнняў мастацкага савета тэатра | 13.01.1998<br>26.11.1998 | 5 | |
| | | 1999 год | | | |
| 3 | | Пратаколы № 15, 19-21 пасяджэнняў мастацкага савета тэатра | 27.01.1999<br>02.12.1999 | 4 | |
| | | 2000 год | | | |
| 4 | | Пратаколы № 22-25, 28-30 пасяджэнняў мастацкага савета тэатра | 25.01.2000<br>24.09.2000 | 10 | |
| | | 2001 год | | | |
| 5 | | Пратаколы № 1-4 пасяджэнняў мастацкага савета тэатра | 26.01.2001<br>20.12.2001 | 27 | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | 2002 год | | | |
| 6 | | Пратаколы № 7, 8 пасяджэнняў мастацкага савета тэатра | 30.05.2002 05.09.2002 | 16 | |
| | | 2003 год | | | |
| 7 | | Пратаколы № 1, 4, 7 пасяджэнняў мастацкага савета тэатра | 15.01.2003 27.05.2003 | 6 | |
| | | 2004 год | | | |
| 8 | | Пратаколы пасяджэнняў мастацкага савета тэатра | 25.05.2004 25.11.2004 | 5 | |
| | | 2005 год | | | |
| 9 | | Палажэнне аб кадравай службе | | 2 | |
| 10 | | Дагаворы на правядзенне канцэртаў і культурна-масавых мерапрыемстваў, дакументы да іх | 08.02.2005 26.10.2005 | 43 | |
| 11 | | Вытворча-фінансавы план тэатра на 2005 год | | 4 | |
| | | 2006 год | | | |
| 12 | | Штатны расклад тэатра на 2006 год і змены да яго | | 12 | |
| 13 | | Дагаворы на правядзенне канцэртаў і культурна-масавых мерапрыемстваў і дакументы да іх | 19.01.2006 04.11.2006 | 43 | |
| 14 | | Вытворча-фінансавы план тэатра на 2006 год | | 2 | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 15 | | “Ученье – свет, но учебников тьма”, рэж.В.Панін. “Волшебная суматоха или однажды под Новый год”. Сцэнарыі. Машынапіс | 2006 | 17 | |
| | | 2007 год | | | |
| 16 | | Штатны расклад тэатра на 2007 год і змены да яго | | 12 | |
| 17 | | “Волшебный карнавал или однажды под Новый год”, рэж.В.Панін, “Новогодние приключения “Огонька”, рэж. І.Гранец Сцэнарыі. Машынапіс | 2007 | 37 | |
| | | Першасная прафсаюзная арганізацыя тэатра | | | |
| 18 | | Фінансавая смета ППА на 2007 год і справаздача аб яе выкананні | | 4 | |
| 19 | | Статыстычная справаздача (форма № 2) ППА тэатра за 2007 год | | 2 | |

У дадзены вопіс уключана 19 (дзевятнаццаць) спраў з № 1 па № 19, у тым ліку:
літарныя нумары:
прапушчаныя нумары:

Вядучы архівіст
аддзела архіваў арганізацый і фарміравання НАФ
Установы “Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва” Н.П.Прынько
__.__._______

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пратакол ЭМК установы
“Беларускі дзяржаўны
архіў-музей літаратуры
і мастацтва”
____________№ ___

УЗГОДНЕНА
Пратакол ЭК дзяржаўнай
тэатральна-відовішчнай ўстановы
“Маладзёжны тэатр эстрады”
__________ № ___